мясцовых жыхароў да новай улады. Далей аўтар успамінае пра нямецкі акупацыйны рэжым на вёске падчас Вялікай Айчынай вайны, дзейнасць партызан, угон людзей у Германію і працягласць баявых дзеянняў напрыканцы вайны. Не менш цікава ў першай частке апісана і вяртанне савецкай улады, складанасці пасляваеннага аднаўлення на вёсцы, агітацыя да ўступлення ў калгасы і ўвядзенне школьнай адукацыі савецкага ўзору.

Неабходна адзначыць, што сам Гаўрылюк С.В. непасрэдна у саміх мемуарах папярэджваў, што пачаў іх пісаць у 72-гадовым узросце, таму найбольш раннія ўспаміны могуць быць недакладнымі і ўвогуле ў дзяцінстве ён мог складаць сваё меркаванне аб чымсці на падставе размоў дарослых і ўласнага эмацыянальнага ўражання.

Таксама да сямейнага архіва аўтара можна аднесці схемы радаводаў бабулі і дзядулі па бацькоўскай лініі, складзеныя блізкім сваяком. Яны захоўваюцца ў электронным варыянце і ўяўляюць сабой генеалагічную схему з імёнамі і гадамі жыцця прамых продкаў і іх братоў і сясцёр. Дадзеная схема была выкарыстана і дапоўнена аўтарам дадзенага артыкула пры складанні сіметрычнага радавода з генеалагічнымі карткамі на кожнага продка сям’і пры падрыхтоўке заліковага праэкта для курса дапаможных гістарычных дысцыплін на другом курсе гістарычнага факультэта БрДУ імя А.С. Пушкіна.

Акрамя таго аўтар актыўна праводзіць работу па збору вусных ўспамінаў сваякоў, якія ведаюць падрабязнасці аб светапогляду, дзейнасці і характару некаторых продкаў, што дазваляе скласці больш поўнае ўяўленне аб гістарычнай і культурнай спадчыне сваёй сям’і.

Такім чынам можна зрабіць вынік, што стварэнне і захаванне сямейнага архіва з’яўляецца найбольш даступным спосабам захавання гістарычнай памяці на ўзроўні мікрагісторыі і неабходным элементам выхавання маладога грамадзяніна і патрыёта. Таксама трэба ўлічваць, што сямейныя архівы непасрэдна звязаны з часам іх стварэння і адлюстроўваюць яго.


1. Архівы Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://archives.gov.by/. – Дата доступа: 08.10.2023.
2. Приймак, Н. И. Мемуары, дневники, письма как исторический источник: учебное пособие/ Н. И. Приймак, К. О. Валегина. – СПб : ЛЕМА, 2018. – 72 с.



**Даўматовіч К.Д.**


## КАЛІ З’ЯВІЛАСЯ ВЁСКА ПАГОСТ САЛІГОРСКАГА РАЁНА НА СТАРОНКАХ ДАКУМЕНТАЎ: 1449 VS 1499 гг.?


*Ключавыя словы:* Салігорскі раён, Пагост, Вялікае Княства Літоўскае, Алелькавічы, лакальная гісторыя, краязнаўства, дакументальны помнік.


Пытанні захавання і выкарыстання дакументальных помнікаў заўсёды з’яўляліся фундаментальнымі ў гістарычнай навуцы. У залежнасці ад таго, як навуковец выкарыстоўваў дакумент прадвызначаюцца высновы даследавання. Аднак час ад часу нават і ў самых вялікіх даследчыкаў спрацоўвае так званы «чалавечы фактар». Адна з падобных памылак стала асновай для нашага пытання: калі з’явілася вёска Пагост сучаснага Салігорскага раёна на старонках дакументаў: у 1449 ці ў 1499 гг.? Удакладненню дадзенага пытання і прысвечаны гэты тэкст.

У 1892 г. гісторыкам М. К. Любаўскім было апублікавана даследванне «Областное деление и местное самоуправление Литовско-Русского государства ко

времени издания первого литовского Статута». Адносна нейкай «судной грамоты, выданной в 1449 году» навуковец адзначыў, што яна замацавала за слуцкім князем Сямёнам Міхайлавічам шэраг двароў, сярод якіх быў і Пагост (*на дадзены момант вёска Пагост-1 Салігорскага раёна Мінскай вобласці – К. Д.*) [8, с. 133]. Пры гэтым М. К. Любаўскі зрабіў спасылку на першы том выдання «Акты, относящиеся к истории Западной России» (1846), у якім размяшчаецца дадзеная «судная грамота». Аднак калі звярнуць увагу на гэтую «судную грамоту 1449 года» у самім выданні, то апынецца, што гэты дакумент датуецца 16 студзеня 1499 г. [1, № 163, с. 185–186]. У наступстве судная грамата з даціроўкай «1499 г. 1. 15.» (*15 студзеня – К. Д.*) будзе надрукавана ў першым томе выдання «Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах» (1936) [3, № 11, с. 99–100], а адсюль перавандруе ў кнігу «Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Салігорскага раёна» (2004) з адзнакай «15 студзеня 1499 г.» [11, с. 41]. У фондзе Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску захаваўся гэты самы дакумент з датай 16 студзеня 1499 г. («Выро*к* кн(ѧ)зю Семен▯ Миха*и*лович▯ Алекса*н*дровича | на Слу*ц*къ и Копы*л* зо всими до ни*х* нале*ж*ност*ѧ*ми») [9, арк. 94адв. – 95адв.].

Відавочна, што пры напісанні сваёй працы М. К. Любаўскі зрабіў «механічную» абдрукоўку і датаваў дакумент «1449 годам» [7, с. 99–100]. Гэтая памылка магла так і забыцца. Аднак на працягу 1980–2000-х гг. у Беларусі ажыцяўляўся вялікі праэкт па стварэнню шматтомнага выдання гісторыка-дакументальных хронік «Памяць» па кожнаму раёну і гораду рэспублікі. У 2004 г. з’явілася кніга па Салігорскаму раёну, у якой Л. І. Шчырын напісаў артыкул пра гісторыю Пагоста ў XV–XVIII стст. У актыкуле адзначалася, што Пагост «…У пісьмовых крыніцах упамінаецца з сярэдзіны XV ст. …» і была прыведзена цытата з даціроўкай «1449 год»з вышэйадзначанай працы М. К. Любаўскага [11, с. 40]. У далейшым гэта дата патрапіла на старонкі сродкаў масавай інфармацыі [2; 7]. Дзеля справедлівасці некаторыя аўтары адводзілі пісьменна зафісаваную гісторыю Пагоста з 1499 г. [7; 10].

Па выніку найбольш ранняя згадка вёскі Пагост Салігорскага раёна на старонках дакументаў адносіцца да 16 студзеня 1499 г. Варта адзначыць, што на дадзенай мясцовасці, па ўсёй бачнасці, пражывалі людзі і раней, пра што сведчыць захаваўшыся курганны могільнік XI–XIII стст. на тэрыторыі сучаснай вёскі [4; 5; 6]. У 1499 г. ад імя вялікага князя літоўскага Аляксандра Казіміравіча і Паноў-Рады быў выдадзены «вырок» па судовай справе паміж слуцкім князем Сяменам Міхайлавічам іМарыяй з яе дачкой Аляксандрай. Марыя скардзілася на Сямёна за тое, што ён «не хочеть припустити кн(ѧ)г(и)ни | Алекса*н*дры, сестры своее, к дѣлу, к Слу*ц*ку и к Копылю». Разглядзеўшы бацькоўскі «лист»-завяшчанне, высвятлілася, што ў Марыі і Аляксандры не было падстаў прэтындаваць на Слуцк і Копыль, таму што іх бацькі яшчэ пры жыцці падзялілі ўсю спадчыну. У выніку за Сямёнам Міхайлавічам і ягонымі нашчадкамі на «вѣчно» былі замацаваны Слуцк і Копыль з усімі прылеглымі валасцямі і дварамі (у тым ліку і двор «Пого*ст*», які належыў да Слуцка). Дадакова адзначалася, што з дадзеных уладанняў «слу*ж*бу зе*м*скую мае*т* на*м* заступовати | по давному», а случчане і капыляне павінны «мосты мостити, и станы дела*ти*, | и стацыя*ми* по*д*нимати, и по*д*воды давати по да*в*ному» [1, № 163, с. 185–186; 3, № 11, с. 99–100; 9, арк. 94адв. – 95адв.; 11, с. 41; 12, с. 24–26].

Такім чынам, адказам на вышэйвызначанае пытанне з’яўляецца – 16 студзеня 1499 г. Менавіта да гэтага часу адносіццасамая ранняя згадка вёскі

Пагост Салігорскага раёна на старонках дакументаў на дадзены момант. Тым не менш абдрукоўка канца XIX ст. у пэўнай меры паўплывала на наратыў пачатка XXIст., стварыўшы непаразуменні ў пытанні найбольш ранняй згадкі вёскі. У сувязі з гэтым пытанні захавання і выкарыстання дакументальных помнікаў і дагэтуль з'яўляюцца актуальнымі ад тэматыкі лакальнай гісторыі да больш глабальных праблем гістарыяграфіі.





**Мал. 1499 г. студзеня 16. Гародня. Вырак слуцкаму князю Сямёну Міхайлавічу Алелькавічу на валоданне Слуцкам і Капылём (з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску)**


1. Акты, относящиеся к истории Западной России : в 5 т. / Арх. комиссия. – Спб.: тип. II отделения Е. И. В. Канцелярии, 1848–1853. – Т. 1: 1340–1506. – 1848. – 428 с.
2. Арцюшчанка, М. Дзе сустракаюцца мінулае з будучым? / М. Арцюшчанка // Шахцёр. – 2008. – 3 красавіка. – С. 22.
3. Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах : у 4 т. / Акадэмія навук БССР, Інстытут гісторыі. – Мінск : Выдавецтва Акадэміі навук БССР, 1936–1954. – Т. 1: IX–XVIII ст. – 678 с.
4. Даўматовіч, К. Гісторыя ў наваколлі: курганны могільнік пад Салігорскам / К. Даўматовіч // Краязнаўчая газета. – 2022. – № 19 (888). – С. 5.
5. Даўматовіч, К. Д. Праблема захавання археалагічных помнікаў (на прыкладзе курганнага могільніка каля вёскі Мяцявічы Салігорскага раёна)[Электронны рэсурс] / К. Д. Даўматовіч // Магілёўшчына: XV выпуск: матэрыялы навуковай канферэнцыі «Гісторыка-культурная спадчына Падняпроўя», 23 чэрвеня 2022 г. / В. М. Аненкаў [і інш.]. – Магілёў : МАКМ, 2022. – 1 электрон. апт. дыск (CD –ROM). – С. 13–15.
6. Даўматовіч, К. Д. Праблема захавання археалагічных помнікаў на прыкладзе курганнага могільніка каля вёскі Мяцявічы Салігорскага раёна / К. Д. Даўматовіч // Archaeologia Hrodnae. Працы археалагічнага гуртка 2021–2022 : зб. навук. арт. / ГрДУ імя Янкі Купалы ; рэдкал.: С. А. Піваварчык (гал. рэд.), А. Д. Гаршкоў. – Гродна : ГрДУ імя Янкі Купалы, 2022. – С. 54–58. – Дэп. у ГрДУ імя Янкі Купалы 22.12.2022, № 0031/22122022.
7. Даўматовіч, К. Дз. Гісторыя Салігоршчыны ў XV – XVIII стст. на старонках сучасных СМІ / К. Дз. Даўматовіч // Краеведение: проблемы и перспективы развития в XXI веке : материалы научно-практической конференции с международным участием, посвящённой 95-летию краеведческого музея Полоцка, Полоцк, 2–3 декабря 2021 г. / сост. И. П. Воднева. –Полоцк : Полоцкое книжное издательство, 2022. – С. 99–104.
8. Любавский, М. К. Областное деление и местное управление Литовско-Русскаго государства ко времени издания первого литовскаго Статута: исторический очерк / М. К. Любавский. – Москва: университетская тип., 1892. – 998 с.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – КМФ-18. Оп. 1. Д. 5.
10. Никитина-Орловская, Г. Из истории родного края / Г. Никитина-Орловская // Лидер-пресс. – 1999. – 24 июня.
11. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Салігорскага раёна / уклад.: М. З. Башлакоў, Л. І. Шырын, А. І. Пляшэвіч – Мінск: БЕЛТА, 2004. – 576 с.
12. Скеп'ян, А. А. Князі Слуцкія / А. А. Скеп'ян. – Мінск: Беларусь, 2013. – 246 с.